# 9-га МАЯ—ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 15 (575) | Субота, 5 мая 1984 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап

**Михаил ЛУКОНИН**

* * *

Четыре года жизни —
год за годом,
четыре года смерти —
день за днём,
во имя мира всем земным
народам
бежали, опоясаны огнём.
Всё, что свершили, —
памятно и свято.
Навеки будут рядом,
без конца —
могила Неизвестного
солдата
и Счастье победившего
бойца!

## ПОДЗВІГУ ЖЫЦЬ У ВЯКАХ

У наступную сераду савецкія людзі, усё прагрэсіўнае чалавецтва адзначаць Дзень Перамогі над германскім фашызмам. Гэтая дата, абазначаная ў календарах чырвоным колерам, з'яўляецца адной з самых важных у гісторыі Краіны Саветаў. Майскія салюты 1945 года назаўсёды захаваюцца ў памяці людзей. Савецкая дзяржава ў смяротнай сутычцы з ударнымі сіламі імперыялізму выратавала лёс нашай Радзімы, сацыялізму, будучыню ўсяго чалавецтва.

Савецкі народ пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі пераадолеў усе нягоды і пакуты вайны, праявіў выключную мужнасць і гераізм, здзейсніў вялікі подзвіг, якому жыць у вяках. У жорсткіх баях Савецкія Узброеныя Сілы разграмілі асноўную масу войск фашысцкай Германіі і яе саюзнікаў. Наша краіна перагарадзіла дарогу фашысцкім агрэсарам да сусветнага панавання. Першы адчувальны ўдар захопнікі адчулі на сабе пад Масквой, дзе восенню і зімой 1941 года разгарнуліся галоўныя падзеі. У выніку бітвы за сталіцу СССР групоўка фашысцкіх войск была разбіта і адкінута ад яе на 100—250 км. Упершыню з пачатку другой сусветнай вайны вермахт пацярпеў паражэнне стратэгічнага маштаба.

Выключнае значэнне ў Вялікай Айчыннай вайне адыграла Сталінградская бітва. У ходзе яе было разгромлена пяць варожых армій. Страты гітлераўцаў і іх саюзнікаў склалі

**М. І. СТАРАВОЙТАЎ,**
**сакратар парткома, кандыдат гістарычных навук.**

каля 1,5 млн. чалавек. Гэтая бітва з'явілася рашаючым этапам у дасягненні карэннага пералому ў вайне.

А апошняя спроба нямецка-фашысцкага камандавання захапіць стратэгічную ініцыятыву поўнасцю правалілася ў выніку пяцідзесяцідзённай Курскай бітвы, у якой было разгромлена 50 дывізій ворага і яго страты склалі звыш 0,5 млн. чалавек. Пасля Курскай эпапеі Чырвоная Армія павяла агульнае стратэгічнае наступленне, якое разгарнулася на фронце працягласцю да 2 тыс. км.

26 сакавіка 1944 г. войскі 2-га Украінскага фронту ў раёне р. Прут першымі выйшлі на дзяржаўную граніцу СССР, а ў кастрычніку яна была аднаўлена на ўсім працягу ад Баранцава да Чорнага мора.

Асаблівы сэнс свята Дня Перамогі набыло сёлета для беларускага народа. Гэта звязана з яго актыўнай падрыхтоўкай да 40-годдзя вызвалення Савецкай Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Летам 1944 года Чырвоная Армія сіламі 1-га Прыбалтыйскага і трох Беларускіх франтоў абрушыла на ворага ўдары сакрушальнай сілы. З велізарным ваенным мастацтвам была праведзена аперацыя «Баграціён», у ходзе якой 3-га ліпеня была вызвалена сталіца Беларусі — г. Мінск.

У барацьбе з фашызмам савецкія людзі былі не адзінокімі. Яны змагаліся пры дапамозе іншых народаў. Антыгітлераўская кааліцыя дзяржаў з розным грамадскім ладам аб'ядноўвала іх намаганні перад тварам грознай небяспекі, які нёс свету фашызм. Аднак імення СССР унёс самы важкі ўклад у разгром фашысцкага блока. У баях з Савецкай Арміяй гітлераўцы панеслі 73% агульных страт.

Подзвігі франтавікоў атрымалі глыбокае прызнанне Камуністычнай партыі, народа. За гады вайны ордэнамі і медалямі СССР узнагароджана звыш 7 млн. савецкіх воінаў. 11.603 чалавекі ўдастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза. Сярод іх — прадстаўнікі ста нацый і народнасцей краіны.

Вялікі ўклад у разгром акупантаў унеслі партызаны і падпольшчыкі. Больш 300 тыс. з іх узнагароджаны ордэнамі і медалямі, а 248 прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

У калектыве нашага універсітэта сёння працуе 48 былых воінаў, партызан і падпольшчыкаў. Іх фотаздымкі мы штодзённа бачым на Дошцы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і па праву ганарымся імі. Усе ветэраны заслужылі нашай вялікай пашаны і прызнання, бо ў цяжкую для Айчыны часіну, не шкадуючы жыцця, змагаліся за яе вызваленне і наша шчаслівае сёння. Ветэраны паказваюць для маладых прыклад у працы, выкананні грамадскіх абавязкаў, вядуць вялікую выхаваўчую і ваенна-патрыятычную работу. І ўсе мы, віншуючы іх з надыходзячым вялікім святам — Днем Перамогі, жадаем ім моцнага здароў'я і яшчэ доўгіх гадоў жыцця.

Маладое ж пакаленне, якое ведае аб вайне толькі з расказаў, літаратуры, па кінафільмах, павінна сваімі справамі яднаць міралюбівыя сілы, змагацца за недапушчэнне новай вайны. Мы заўсёды павінны памятаць, што ў барацьбе з фашызмам страцілі 20 млн. сваіх суайчыннікаў. Дарагой цаной савецкім людзям дасталася Перамога! І трэба заўжды пільна стаяць на ахове міру, каб больш ніколі над планетай не пранёсся ўсё знішчаючы ваенны смерч.

## СВЯТА МІЛЬЁНАЎ




Перыядычны друк для савецкага грамадства даўно стаў састаўной часткай агульнапартыйнай, агульнанароднай справы. У. І. Ленін лічыў друк магутным сродкам ідэйнага ўздзеяння, палітычнага кіраўніцтва грамадствам. Таму не выпадкова ўстаноўлены Дзень друку як свята не толькі журналістаў і паліграфістаў, але і ўсяго савецкага народа. Яно прымеркавана да дня выхаду першага нумара газеты «Правда». Упершыню гэты дзень як свята рабочага друку адзначаўся 70 гадоў таму назад. Згодна рашэння ЦК РКП(б), адобранаму XI з'ездам партыі, Дзень друку стаў штогодна адзначацца з 1922 года.

## УРАЧЫСТА, РАДАСНА

З пачуццём вялікага гонару за нашу сацыялістычную Радзіму, яе дасягненні ў камуністычным будаўніцтве калектыў універсітэта, як і ўсе савецкія людзі, адзначыў Першамайскае свята. Сёлета яно супала з юбілеем ГДУ — 15-годдзем з дня адкрыцця другога ў рэспубліцы універсітэта.

28-га красавіка ў актавай зале адбыўся ўрачысты сход выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў, прысвечаны Дню міжнароднай салідарнасці працоўных і юбілею ГДУ.

Уступным словам сход адкрыў сакратар парткома М. І. Старавойтаў.

Велічна прагучалі гімны СССР і БССР.

З дакладам на сходзе выступіў дацэнт кафедры гісторыі КПСС А. П. Мяшчэрскі. Гаворачы аб свяце вясны і працы, барацьбе міралюбівых сіл планеты за захаванне і ўмацаванне міру, ён сказаў і аб тых поспехах, якіх дасягнуў за 15 гадоў свайго існавання калектыў нашага універсітэта.

Начальнік аддзела кадраў П. А. Савінскі зачытаў загад, у якім рэктар акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць павіншаваў калектыў універсітэта з Першамайскім святам і 15-гадовым юбілеем ГДУ. За дасягнутыя поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі, развіццё навуковых даследаванняў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці вялікая група выкладчыкаў і супрацоўнікаў узнагароджана Ганаровымі граматамі універсітэта. Многім членам калектыву, у тым ліку студэнтам, аб'яўлена падзяка.

Перад удзельнікамі сходу выступілі са справаздачным канцэртам самадзейныя артысты эканамічнага факультэта.

У дзень 1 Мая лепшыя прадстаўнікі універсітэцкага калектыву прынялі ўдзел у святочнай дэманстрацыі працоўных ардэнаноснага Гомеля.



На здымку: у першамайскай калоне ГДУ.

Фота С. Коваля.

## ВІНШУЕМ!

За шматгадовую плённую работу па падрыхтоўцы спецыялістаў для народнай гаспадаркі і камуністычнаму выхаванню моладзі, актыўную прапагандысцкую дзейнасць і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння дацэнт кафедры гісторыі КПСС Гомельскага дзяржаўнага універсітэта **СЕМЯНЧУК** Яўген Антонавіч узнагароджаны Ганаровай граматай абкома КПБ і абласнога Савета народных дэпутатаў.

## ПРЫСВЕЧАНЫ ДНЮ ПЕРАМОГІ

7-га мая ў актавай зале універсітэта адбудзецца ўрачысты вечар, прысвечаны 39-ай гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. У праграме — даклад і святочны канцэрт. На сцэне выступяць лепшыя самадзейныя артысты факультэтаў ГДУ.

Пачатак вечара — у 19 гадзін.




# ГАВОРЫЦЬ ПАМЯЦЬ СЭРЦА

ДЗЕ Б ТЫ ні жыў, час ад часу цябе нібы магнітам цягне на радзіму. Так бывае і са мной. Вось і нядаўна я наведаў калыску свайго дзяцінства — Віцебшчыну. Багатая, слаўная гісторыя краю бясконцых лясоў і шматлікіх азёр. Тут, у 26 кіламетрах ад абласнога цэнтра — горадзе Гарадок, я нарадзіўся і вырас, закончыў дзесяцігодку. І тут, у чэрвені 1941 года, пачуў самае страшнае слова «вайна». У маёй кішэні ляжалі атэстат сталасці і камсамольскі білет. І яны як бы з'явіліся мандатам на самае суровае ў жыцці выпрабаванне — удзел у барацьбе з фашысцкай навалай.

Словамі не перадаць таго нястрымнага парыву, з якім рваліся ўчарашнія школьнікі ў Чырвоную Армію, на фронт. Не толькі юнакі, але і дзяўчаты. Кожнаму хацелася як мага хутчэй помсціць ворагу, які вераломна абрушыўся на першую ў свеце Краіну Саветаў, яе вялікія эканамічныя і сацыяльныя заваёвы.

Гарачым полымем вайны абпалена і маё юнацтва. І цяпер ёсць аб чым нагадаць, расказаць. Калі даводзіцца сустракацца з вучнямі, моладдзю, усе без выключэння з затоеным дыханнем слухаюць мой расказ пра Аляксандра Матросава. З ім мы былі курсантамі аднаго ваеннага вучылішча, разам адпраўляліся ў свой першы бой. Для Сашы, бясстрашнага камсамольца, ён стаў апошнім. Я ў тым баі каля вёскі Чарнушкі атрымаў сваё першае раненне.

Лячэнне — і зноў франтавыя дарогі. Са Смаленшчыны яны прывялі мяне да родных мясцін. Сэрца было перапоўнена вялікай радасцю, калі пачалі вызваляць Віцебшчыну, сінявокую як співаецца ў песні, Беларусь. Разам з тым яно шчымела вялікім болем ад тых нязмерных страт, што нанеслі радзіме акупанты. Нас сустракалі людзі, вытрымаўшыя неймаверныя пакуты. Сярод жыхароў рэдка можна было ўбачыць мужчыну. Пераважная большасць іх загінула, змагаючыся з ворагам у партызанскіх атрадах. Горкі асадак выклікалі суцэльныя папялішчы.

І ўсё ж у гэтай сітуацыі неяк асабліва абвострана праяўлялася пачуццё пераможцаў, усведамленне таго, што мы хутка выб'ем гітлераўцаў за межы роднай Беларусі.

Моцныя ўдары па ворагу на тэрыторыі нашай рэспублікі наносілі і войскі І Прыбалтыйскага фронту, у састаў якога ўваходзіў наш гвардзейскі мотаінжынерны батальён. На танках прарыву мы ўпэўнена рухаліся наперад. І так хутка, што пры вызваленні Гарадка я нават не змог пабачыцца з роднымі ці знаёмымі. Праўда, гэта магчымасць прадставілася некалькі пазней, калі пры вызваленні Полацка быў лёгка паранены і камандзір даў тры дні водпуску, каб наведаў бацькоў.

Вызваленне роднага краю для мяне, як і для кожнага беларуса, стала самым памятным. Аднак раскажу толькі пра адзін эпізод. Тады я быў камандзірам аддзялення. Яно налічвала ўсяго 9 чалавек. І сярод іх былі людзі пяці нацыянальнасцей. Хіба ж гэта не яркі прыклад сапраўднага савецкага інтэрнацыяналізму!

Нашаму батальёну неабходна было навесці пераправу праз Заходнюю Дзвіну. На яе супрацьлеглым беразе немцы стварылі ўзмоцнены плацдарм. Усімі сіламі яны імкнуліся затармазіць наступленне часцей арміі генерала Белабарodава.

Да рэчкі нас даставілі на танках, якія хутка зніклі ва ўкрыццях. Следам за намі прыбыў батальённы лёгкі наплыўны парк. Аперацыю пачалі днём. Фашысты павялі абстрэл з усіх відаў зброі. Асабліва надакучалі варожыя мінамёты. Смяротныя грузы скідалі на нас і з фашысцкіх самалётаў. Нягледзячы на ўсе перашкоды нашы сапёры настойліва выконвалі пастаўленую задачу.

Пры адным з налётаў авіяцыі праціўніка бомба ўпала побач з наладжваемай пераправай. Узрыўной хваляй выбіла з-пад яе пантонную лодку, а аднаго з байцоў скінула ў Дзвіну. Не губляючы ні секунды, я прыгнуў у студзёную ваду і з дапамогай падаспеўшых баявых таварышаў выратаваў яго.

Пацярпеўшага перадалі санітарам, а самі працягвалі наводзіць пераправу. Да нас далучыліся хімікі. Хутка над Дзвіной павісла дымавая завеса. Работа па навядзенню пераправы пайшла больш паспяхова. І неўзабаве праз яе рушылі асноўныя сілы арміі Белабарodава. Вораг панёс значныя страты, яшчэ далей адкаціўся назад.

Пасля Беларусі мне давялося ўдзельнічаць і ў вызваленні Прыбалтыкі. Там я быў цяжка паранены. Доўга лячыўся ў шпіталі, пасля чаго зімой пераможнага 1945 года мяне дэмабілізавалі. Дамоў вярнуўся інвалідам. І толькі ўжо ў бацькоўскім доме атрымаў радасную вестку аб тым, што за подзвіг, праяўлены пры вызваленні родных мясцін, я ўзнагароджаны ордэнам Славы III ступені.

Праз сорак гадоў пасля вызвалення непазнавальным стаў мой родны край. Шчасліва, заможна жывуць тут мае землякі ў адзінай шматнацыянальнай сям'і народаў СССР. І радасна, што вучні Гарадокскай сярэдняй школы імкнуцца як мага больш ведаць і шанаваць памяць яе былых выхаванцаў — загінуўшых і жывых, хто агульнымі намаганнямі каваў перамогу над заклятым ворагам, ствараў трывалы падмурак сённяшняй светлай явы.

..Непрыкметна бягуць гады. Усё больш і больш яны аддаляюць нас ад суровага ваеннага ліхалецця. Радзеюць рады былых франтавікоў, падпольшчыкаў, партызан. І толькі людская памяць не падуладна часу. Хто прайшоў праз пекла вайны, не забудзе яе да скону дзён сваіх. Будуць памятаць аб ёй і нашы нашчадкі.

**У. СІДАРАЎ,**
**дацэнт кафедры філасофіі, кавалер ордэнаў «Чырвонай Зоркі» і Славы III ступені.**

# СЯБРОЎКІ

## *Аб земляках*

**Бадай што не знойдзецца ў Беларусі чалавека, які б не ведаў імя нашай славутай зямлячкі Галіны Дакутовіч. Подзвіг адважнай лётчыцы, як і подзвіг многіх членаў жаночага авіяпалка, стаў сапраўдным сімвалам высокага патрыятызму, беззапаветнага і самаахвярнага служэння Радзіме. Аднак далёка не ўсім вядома, што ў адным і тым жа класе Гомельскай сярэдняй школы імя Камінтэрна, разам з Галінай вучыліся тры дзяўчыны, якія сталі яе сапраўднымі баявымі сяброўкамі. Гэта Алена Мацвеева, Тамара Курыльчык і Паліна Гельман. Здружыла дзяўчат не толькі сумесная вучоба, але і адзіныя захапленні, сярод якіх у першую чаргу неабходна назваць спорт.**

У 1935 годзе сяброўкі ўпершыню прымаюць удзел у юнацкім першынстве рэспублікі па спартыўнай гімнастыцы. І яны з поспехам адстаялі гонар Гомельскай вобласці — каманда школы імя Камінтэрна стала пераможцай спаборніцтваў і была ўзнагароджана аксамітным сцягам з партрэтам У. І. Леніна, а Галіна Дакутовіч стала прызёрам у асабістым заліку. З гэтага часу спорт стаў для чатырох сябровак верным спадарожнікам іх жыцця. Яны былі членамі зборнай вобласці па спартыўнай гімнастыцы, удзельнічалі ў самых разнастайных спаборніцтвах. Так, ужо на наступны год у складзе зборнай Гомеля Г. Дакутовіч і Т. Курыльчык прынялі ўдзел у першынстве гарадоў краіны, якое адбылося ў Ленінградзе. Але не толькі гімнастыкай захапляліся дзяўчаты. Яны прымалі ўдзел у гарадскіх спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы, плаванню, лыжнаму і канькабежнаму спорту, дзе таксама паказвалі нядрэнныя вынікі.

ШКОЛУ ўсе сяброўкі закончылі з адзнакай, але далейшы іх лёс складваўся па-рознаму. Алена Мацвеева стала студэнткай Ленінградскага інстытута замежных моў. Тры гады вучобы праляцелі непрыкметна. Настрой у дзяўчыны выдатны. Яна едзе ў родны горад на канікулы. Цягнік ад перона Ленінградскага вакзала адышоў 21 чэрвеня 1941 года ў 7 гадзін вечара, а ў Гомелі яе ўжо сустрэла жахлівая вестка. Лена з сяброўкамі рвецца на фронт, аднак вымушана эвакуіравацца разам з бацькамі у г. Курган, дзе зноў спрабуе трапіць у дзеючую армію. Атрымаўшы чарговае «не», дзяўчына не апускае рукі, яна вырашае дапамагчы Чырвонай Арміі на месцы, ідзе працаваць у механічны цэх «Гомсельмаша», які быў эвакуіраваны ў гэты горад. «Вучыцца буду пасля вайны», — гаворыць яна бацькам.

Праз некаторы час збылася і яе запаветная мара: дапамагло добрае веданне замежных моў. 23 жніўня 1942 г. дабраахвотнік Алена Мацвеева становіцца сувязісткай 29-га асобнага палка сувязі, у складзе якога прымала ўдзел у прарыве блакады Ленінграда на Сіняўскіх вышынях, ваявала на Карэльскім фронце. А вучылася сапраўды пасля вайны, ужо ў Маскоўскім інстытуце замежных моў, пасля заканчэння якога працавала настаўніцай СШ № 27 г. Гомеля.

Баявыя ўзнагароды, медаль «Ветэрана працы» самі гавораць аб яе ратным і мірным жыццёвым шляху.

Гераічным быў і лёс Тамары Курыльчык, якая сустрэла вайну студэнткай Маскоўскага гідраметэралагічнага інстытута. Яна марыць аб фронце, аб авіяцыі. І тут дапамог выпадак — на яе звярнулі ўвагу на спаборніцтвах па гімнастыцы. Заключэнне медыцынскай камісіі аднагалоснае—

# ПАРОЛЬ: «НЕЗАБУДКА»

**Амаль 40 гадоў жывём мы ў міры і шчасці. Заваёўвала гэты мір і пакаленне юнакоў і дзяўчат, чыя маладосць супала з гадамі цяжкіх выпрабаванняў, «была недолгой, покрывала с ь ранней сединой». 15-гадовай дзяўчынкай - падлеткам пачула страшнае слова «вайна» Ларыса Рыгораўна Петухова.**



На здымку: Л. Р. Круглікава-Петухова. Фота 1945 года.

ВЫБУХІ гармат, гром артылерыйскай канонады з кожным днём было чуваць усё больш выразна. Адыходзілі эшалоны з эвакуіруемым насельніцтвам, спяшаючы хутчэй адвезці жанчын, дзяцей, старых ад фашысцкай навалы, далей на Усход.

Рыгор Гаўрылавіч Круглікаў пайшоў на фронт з першых дзён вайны. Яго жонка і дзве дачкі засталіся ў вёсцы Сенькава, што ў дзесяці кіламетрах ад Горак, на лясной доследнай станцыі, дзе ён працаваў да вайны малодшым навуковым супрацоўнікам. Трывожна было на душы ў салдата.

— Як яны там?

Марфа Аўрамаўна з дочкамі Лідай і Ларысай эвакуіравацца не паспелі. Вораг ужо заняў Оршу, Горкі, рваўся далей.

...Ларыса толькі скончыла 8 класаў Горацкай сярэдняй школы Магілёўскай вобласці, як страшная вестка ўварвалася ў жыццё савецкіх людзей. «Вайна!».

У адзіным патрыятычным парыве, гатоўнасці стаць на абарону Радзімы, прыйшлі ўчарашнія васьмікласнікі ў ваенкамат. Была сярод іх і Ларыса Круглікава.

Хмуры, з чырвонымі ад недасыпання вейкамі, маёр сказаў ім, як адрэзаў:

— Малыя яшчэ. Падрасціце крыху!

Як жа было ім чакаць, гэтым юнакам і дзяўчатам-падлеткам, калі вораг таптаў савецкую зямлю, набліжаўся да родных мясцін?

Аб іх успомнілі пазней, калі ў Горацкім раёне, як і па ўсёй Беларусі, пачалі стварацца падпольныя арганізацыі, партызанскія атрады для барацьбы з ворагам на акупіраванай тэрыторыі. Стала сувязной партызанскага атрада брыгады «Звязда» і Ларыса Круглікава. Прыгожыя блакітныя вочы былі ў дзяўчыны, за іх і далі Ларысе пароль: «Незабудка».

У лес, на доследную станцыю, дзе жыла яна разам з маці, сястрой і Верай Георгіеўнай Мурашовай, жонкай аднаго з супрацоўнікаў станцыі, прыходзілі людзі, якія давалі ёй заданні. Строгай была канспірацыя — не ведалі нават сапраўдных імёнаў адзін аднаго. Толькі значна пазней, стане вядома Ларысе, што былі гэта Грыша Грыгар'ян і Сяргей Вараб'ёў.

Часта хадзіла ў Горкі дзяўчына, каб атрымаць каштоўныя і такія неабходныя для партызан звесткі: падлічыць, колькі варожай баявой тэхнікі налічваецца ў гарадку, якія вайсковыя часці тут размяшчаюцца, колькі эшалонаў на чыгуначнай станцыі. Ніхто з немцаў не звяртаў увагі на дзяўчынку з торбай за плячыма, у падраным адзенні, запэцканых гразёю лапцях. Ці мала асірацелых дзяцей блукала тады па вёсках, гарадках? Не здагадваліся фашысты, што ў іх «пад самым носам» ходзіць партызанская сувязная.

— Як ні дзіўна, — успамінае Ларыса Рыгораўна Петухова той час, — страху не адчувала. Наадварот, у мяне было пачуццё ўпэўненасці, што баяцца мне няма чаго. Я — на сваёй зямлі, сваёй Радзіме, і няхай лепш вораг баіцца нас, калі нават дзеці, падлеткі ваююць супраць яго. Няхай ён жыве ў паўсядзённым страху, што давядзецца расплачвацца сваім жыццём за гора і пакуты, прынесеныя на савецкую зямлю, куды яго ніхто не клікаў. А калі і баялася, то толькі за адно — свае лапці, у якіх хадзіла на заданні і зімой, і летам. Пад падшытай на падэшвах скурай заўсёды былі схаваны ці партызанскія лістоўкі, ці шыфроўкі. Згубіць свой абутак-тайнік я проста не мела права.

Аднойчы атрымала Ларыса ад гарадскіх падпольшчыкаў надзвычай важнае заданне — перадаць у атрад трывожную вестку: фашысты збіраюцца заслаць да іх нямецкага лазутчыка. Цяпер ад яе залежыў лёс соцень байцоў, лёс усяго атрада.

Стаяла ранняя вясна. Лёд на рацэ Проня, праз якую трэба было пераправіцца на

